*А.А. ГУЖАЛОЎСКІ*

# СТАНАЎЛЕННЕ СЕТКІ КРАЯЗНАЎЧЫХ МУЗЕЯЎ У БССР У 20-я ГАДЫ ХХ СТАГОДДЗЯ

Адной з найбольш яскравых з'яў культурнага жыцця ў СССР 20-х гг. быў краязнаўчы рух. Па словах вядомага расійскага гісторыка С.О. Шміта, першае дзесяцігоддзе савецкай улады – прыкладна да рубяжа 1920–1930 гг. – можна назваць "залатым дзесяцігоддзем" развіцця краязнаўства[1].

Тэрмін "краязнаўства" вельмі ёмісты, шматзначны і ўключае: 1) навукова-даследчую і навукова-папулярызатарскую дзейнасць, накіраваную на комплекснае (гуманітарнае і прыродазнаўчае) вывучэнне пэўнай мясцовасці, края; 2) апору на міждысцыплінарныя навуковыя сувязі; 3) выхаванне культурай, гістарычнымі традыцыямі, дзякуючы чаму можна спасцігнуць складаную сістэму сувязей паміж прыродай і грамадствам; 4) форму самаарганізацыі грамадства і станаўлення грамадзянскай супольнасці. Іншымі словамі, краязнаўства вызначае як характар засваення мінулага, так і спосаб перабудовы сучаснасці.

Усё гэта цалкам адносіцца і да беларускіх зямель, дзе глеба для развіцця краязнаўства была падрыхтавана яшчэ да усталявання савецкай улады. Нам цяжка казаць аб непасрэднай пераемнасці ў музейнай дзейнасці дарэвалюцыйных радзімазнаўцаў і беларускіх краязнаўцаў 20-х гг. На старонках краязнаўчай перыёдыкі, што выдавалася ў БССР, мы знаходзім павярхоўныя, часам нават здзеклівыя ацэнкі дзейнасці радзімазнаўцаў. На нашу думку, сам факт існавання дарэвалюцыйных музеяў краязнаўчага профілю (аб чым, безумоўна, было вядома беларускай інтэлігенцыі) ствараў культурны прэцэдэнт, даваў прыклад для іншых.

Агульную каардынацыю музейнай дзейнасці краязнаўчых таварыстваў, а таксама яе навукова-метадычную падтрымку ажыццяўляла Цэнтральнае бюро краязнаўства, якое ўздымала пытанні музейнага будаўніцтва амаль на кожным пленуме, абмяркоўвала гэтыя праблемы на старонках часопіса "Наш край". Так, ужо ў першым нумары быў апублікаваны ўзорны статут раённага краязнаўчага таварыства, дзе сярод яго галоўных мэт вызначалася арганізацыя ўласнага музея[2]. У шэрагу артыкулаў знайшлі адлюстраванне праблемы методыкі збора экспанатаў і пабудовы музейных экспазіцый[3]. На пасяджэнні ЦБК 30 чэрвеня 1927 г. быў зацверджаны раскпад выступленняў па краязнаўству на радыё, адно з якіх мела назву "Як арганізаваць мясцовы музей"[4]. На курсах-студыі па краязнаўству пры БДУ В.Ю. Ластоўскі чытаў цыкл лекцый "Музеязнаўства і музеябудаўніцтва"[5]. Аналагічныя курсы былі ўведзены ў праграмы педтэхнікумаў.

Кіраўніцтва ЦБК рэгулярна трымала на кантролі матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці краязнаўчых музеяў, большасць з якіх знаходзілася ў невялікіх непрыстасаваных будынках, дзе немагчыма было разгарнуць сур'ёзную навукова-фондавую і экспазіцыйную работу. Таму ў сярэдзіне 1926 г. бюро афіцыйна звяртаецца да старшынь акрвыканкомаў аб адводзе памяшканняў пад краязнаўчыя музеі[6].

Краязнаўчыя музеі былі вынікам работы таварыстваў па вывучэнню прыроды, гісторыі і эканомікі сваёй мясцовасці. Адпаведна экспазіцыі ў асноўным складаліся з трох галоўных аддзелаў: прыродазнаўчага, культурна-гістарычнага і грамадска-эканамічнага. У некаторых з іх пачалі фарміравацца мастацкія калекцыі. З простых сховішчаў навуковага матэрыялу грамадскія краязнаўчыя музеі БССР у 20-я гг. пераўтварыліся ў своеасаблівыя навукова-асветніцкія цэнтры, якія праводзілі работу ў цеснай сувязі з сістэмай народнай адукацыі.

Шырокая работа па стварэнню краязнаўчых музеяў разгарнулася пасля І Усебеларускага краязнаўчага з'езда (люты 1926 г.), дзе была ўхвалена пастанова, згодна з якой кожная краязнаўчая арганізацыя павінна была



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

пабудаваць свой музей, які б адлюстроувау у экспазіцыях прыроду, гаспадарку і побыт дадзенага раёна[7].

Першы грамадскі краязнаучы музей на тэрыторыі БССР з'явіуся у Слуцку. Дзейнасць па стварэнню слуцкага музея пачалася у 1921 г. па ініцыятыве мясцовага аддзела народнай асветы. Новы імпульс гэтая праца атрымала пасля прызначэння у слуцкі аддзел на пасаду інспектара сацыяльнага выхавання М.І. Каспяровіча. У 1922 г. ён заснавау у горадзе камісію беларусазнауства, на якую была ускладзена праца па арганізацыі краязнаучага музея. Непасрэдная работа па камплектаванню калекцый, пошуку памяшкання і г. д. была даручана музейнаму бюро у складзе Яфімава (старшыня), Бараноускага, Барташэвіча і Яновіча[8].

Адразу ж пасля стварэння слуцкае музейнае бюро разгарнула актыуную працу. Былі праведзены некалькі экспедыцый па збору рэчавага матэрыялу і запісу фальклору, разасланы анкеты з мэтай выяулення помнікау старажытнасці і прыроды, зроблены захады па іх ахове. Урэшце, сябры бюро распрацавалі план стварэння школьных павятовых краязнаучых музеяу, ідэя якіх прапагандавалася таксама праз лекцыйную дзейнасць. Першыя сабраныя калекцыі сябры музейнага бюро прадэманстравалі ужо у 1923 г. на павятовай сельскагаспадарчай выставе, дзе меуся спецыяльны этнаграфічны аддзел. Пасля закрыцця выставы калекцыі, сабраныя сябрамі бюро, былі перавезены у будынак Слуцкай царквы-брамы, які да 1926 г. выкарыстоувауся у якасці фондасховішча[9].

Адкрыццё новай экспазіцыі музея адбылося у слуцкім Доме культуры 28 сакавіка 1927 г. У той час на ёй было прадстаулена 1946 прадметау, згрупаваных у тры аддзелы:

1) культурна-гістарычны уключау партрэты слуцкіх князёу, рукапіснае евангелле, епітрахіль і посах XVI ст., малюнкі Катарбінскага, неалітычныя малаткі і цёслы, знойдзеныя у курганах чарапы, косці, гаршкі, шкляныя пацеркі, галауную грыуну, жалезную сякеру XII ст., фрагмент кальчугі, план Слуцка 1780 г., палову слуцкага паса XVIII ст. з надпісамі "Лео Маджарскі", "в граде Слуцке", нумізматычную калекцыю, партрэты, мастацкія вышыукі XVIII ст., старажытныя цэглы, прылады працы, ядры ад гармат;

2) прыродна-геаграфічны – тапаграфічную і глебавую трохвярстовыя карты Слуцкай акругі, планы гарадоу, алеявыя малюнкі пейзажау Случчыны, фотаздымкі палескіх тыпау жанчын і дзяучат у нацыянальнай вопратцы, сляпога з павадыром, пастушка, лірнікау, чучалы дзіка, сусла, пацука, крата, геаграфічныя карты, скпадныя на дрэве, калекцыі матылёу, мінералау і мясцовых раслін;

3) грамадска-эканамічны аддзел – альбом тканін, мадэль бараны, снапкі збожжа гаспадароу, атрымаушых прэміі на сельскагаспадарчай выставе, узоры насення, вырабы народнай творчасці, мадэль моста, карту эканамічнай сеткі Слуцкай акругі, калекцыю па ахове здароуя і інш.

Пры музеі існавала бібліятэка, якая складалася з 1334 назвау[10]. Музей, адкрыты для публікі два дня на тыдзень, карыстауся вялікай папулярнасцю – толькі за першыя пяць месяцау існавання яго агледзелі 7254 індывідуальных наведвальнікау, а для 559 чалавек было праведзена 12 экскурсій.

Пасля прыняцця курсу на індустрыялізацыю СССР на XIV з'ездзе ВКП(б) у якасці найважнейшага накірунку дзяржаунай эканамічнай палітыкі разглядалася стварэнне новай тэхнікі і аваloданне ёю. У сувязі з гэтым развівалася палітэхнічная адукацыя, у якой значная роля адводзілася палітэхнічным музеям. Прапаганда дасягненняу тэхнікі шляхам увядзення у экспазіцыю мадэляу, макетау, дэталяу машын вялася многімі краязнаучымі музеямі СССР. У БССР першыя захады у гэтым накірунку былі зроблены Бабруйскім акруговым таварыствам краязнауства.

Бабруйскі краязнаучы музей быу створаны у 1924 г. мясцовымі краязнауцамі на чале з энтузіястам музейнай справы Ц. Славіным. Музей



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

размяшчауся у невялікім драуляным будынку, дзе у чатырох пакоях была разгорнута экспазіцыя. Асноуны экспазіцыйны аддзел быу прысвечаны заводскаму і фабрычнаму жыццю Бабруйшчыны. У ім Ц. Славін размясціу мадэлі, якія дэманстравалі працэс вытворчасці на мылаварным, масла-бойным, дрэваапрацоучым, гутным і іншых заводах. Усё гэта ілюстравалася схемамі, статыстычнымі дадзенымі вытворчасці і збыту, дыяграмамі прафесійных хвароб і неабходнымі тлумачэннямі па санітарыі і гігіене. У гэтым жа аддзеле меуся пададдзел электрыфікацыі, дзе наглядна дэманстраваліся канструкцыі тэлефона, званка, тэлеграфа, лямпы, кінаапарата. Меншымі па памерах былі аддзелы сельскай і лясной гаспадаркі, землявробства, пчалярства, меліярацыі, саматужніцтва, палявання. Асобна дэманстравалася прыродазнаучая калекцыя – выкапні, гербарыі, чучалы птушак і жывёл. Мелася невялікая колькасць экспанатау па археалогіі і этнаграфіі Бабруйшчыны[11]. Праз два гады пасля заснавання музея у лютым 1926 г. удзельнікі 1-й краязнаучай канферэнцыі Бабруйскай акругі канстатавалі, што "адным з найважнейшых дасягненняу таварыства з'яуляецца арганізацыя Бабруйскага акруговага музея, у якім ужо ёсць каля 1000 экспанатау"[12].

Абсалютную большасць наведвальнікау складалі навучэнцы і ваеннаслужачыя. Рабочыя, сяляне, прадстаунікі інтэлігентных прафесій амаль не праяулялі цікавасці да музея. Дадзеныя паказчыкі можна растлумачыць імкненнем сяброу краязнаучага таварыства максімальна выкарыстаць патэнцыял музея у педагагічных мэтах. З іншага боку, навучэнцы і ваеннаслужачыя уяулялі "лёгкаарганізуемыя" сацыяльныя групы насельніцтва.

Хуткае павелічэнне колькасці наведвальнікау і фондавых калекцый прымусіла кіраунiцтва краязнаучага таварыства у 1930 г. узняць перад акруговым выканкомам пытанне аб новым памяшканні для музея. Хутка яно знайшлося – гэта быу большы па плошчы будынак з прыбудовай для фондасховішча. Але фінансаванне музейных работ, за выключэннем невялікага заробку загадчыка музея Ц. Славіна, з мясцовага бюджэту так і не было адкрыта. Тым не менш музейны актыу у 1930 г. планавау арганізаваць пры музеі метэастанцыю, закласці паказальныя участкі паляводства, ілюстраваць у натуральным выглядзе жыццё шкоднікау, правесці іншыя лабараторна-даследчыя работы.

Адначасова з бабруйскім краязнаучыя музеі узнікпі яшчэ у двух акруговых цэнтрах БССР – Оршы і Барысаве.

Краязнаучая праца, якая пачала разгортвацца на Полаччыне пачынаючы з восені 1925 г., таксама выклікала патрэбу у арганізацыі акруговага краязнаучага музея. 3 верасня 1925 г. музейная рада пад кіраунiцтвам мясцовага настауніка С. Мялешкі распачала збор і сістэматызацыю экспанатау. Ёй дапамагалі каля 450 сяброу раённых краязнаучых таварыствау, якія дасылалі у Полацк каштоуныя знаходкі, праводзілі экскурсіі, збіралі звесткі аб нерухомых помніках. Энтузіязм краязнауцау дазволіу ужо у чэрвені 1926 г. разгарнуць сталую экспазіцыю у будынку Сафійскага сабора. Перадача музею гэтага будынка адбылася дзякуючы прыхільнаму стауленню кіраунiцтва Полацкага акрвыканкома, які штогод выдзяляу на музейныя работы 1000 рублёу[14].

Музейная рада Полацкага акруговага таварыства краязнауства прыкладала актыуныя намаганні па папулярызацыі сабраных калекцый. Нягледзячы на абмежаваны доступ (музей быу адкрыты тры дні на тыдзень з 10 да 4 гадзін), яго наведвала 5 тыс. чалавек у год.

30 ліпеня 1926 г. пасля сямімесячных падрыхтоучых работ адбылося адкрыццё Клімавіцкага акруговага краязнаучага музея (Калінінская акруга). У аснову яго фондавых калекцый былі пакладзены нешматлікія курганныя знаходкі і старажытныя манеты, якія засталіся ад музея мужчынскай гімназіі, існавaушага у горадзе да Першай сусветнай вайны. Музей складауся з 5 аддзелау: заалагічнага, археалагічнага, гістарычнага, нумізматычнага і мас-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

тацкага. У хуткім часе планавалася адкрыццё двух новых аддзелау – рэлігійнага і краязнаучага.

Найбольш каштоуным у навуковых адносінах быу археалагічны аддзел, дзе першыя наведвальнікі маглі убачыць помнікі старажытнаегіпецкага мастацтва (бронзавыя статуэткі Азірыса, Апіса, Лунуса і інш.), палеалітычныя помнікі (крамнёвыя тапары, долаты, скрабкі), курганныя знаходкі (пацеркі, завушніцы, спражкі, вісочныя кольцы, шыйныя абручы), сярэдневяковую зброю (мячы, кальчугі, панцыры). У гістарычным аддзеле прыцягвала увагу калекцыя бюстау старажытнарымскіх палкаводцау і палітычных дзеячау, у мастацкім – калекцыі саксонскай парцаляны і французскіх гравюр з малюнкау Вернэ[15].

Апошні акруговы краязнаучы музей паустау у Мазыры. Рашэнне аб яго стварэнні было ухвалена на агульным сходзе мазырскага акруговага таварыства 3 красавіка 1927 г.[16]

Як і у папярэдніх выпадках, фарміраванне яго калекцый было вынікам аматарскай працы мясцовага насельніцтва у галіне вывучэння краю. Так, мазырскі саюз паляунічых арганізавау збор арніталагічнай калекцыі. Летам 1927 г. падчас удзелу сяброу мазырскага таварыства у экспедыцыі Усесаюзнага музея нарадазнауства значна папоунілася этнаграфічная калекцыя. Акрамя таго, на працягу 1927–1928 гг. фонды узбагацілі археалагічныя знаходкі, нумізматыка, царкоуныя старажытнасці, а таксама прыродазнаучая калекцыя, што дазволіла адкрыць музей для агляду 1 студзеня 1929 г.[17]

Да 1926 г., акрамя вышэйпералічаных, вельмі актыуную дзейнасць разгарнулі Мінскае, Віцебскае, Магілёускае і Гомельскае акруговыя краязнаучыя таварыствы. Але у сувязі з тым, што у гэтых гарадах існавау Беларускі дзяржауны музей і яго аддзяленні, з якімі таварыствы шчыльна супрацоунічалі, самастойных краязнаучых музееу там не стварылі. Цэнтр увагі у сваёй музейнай дзейнасці гэтыя таварыствы перасунулі на раённыя гарады (напрыклад, у Віцебскім таварыстве гэтым займалася асобная секцыя).

Не менш важнай з'явай у музейным жыцці Беларусі 20-х гг. было масавае стварэнне раённых краязнаучых музееу. Большасць з іх узнікла у 1927–1928 гг., што сведчыла аб новым этапе развіцця краязнаучага руху, яго пранікненні углыб правінцыі. Для беларускай гістарычнай і прыродазнаучых навук, якія знаходзіліся у той перыяд у стадыі назапашвання і сістэматызацыі фактау, падобная з'ява мела асаблівае значэнне. Беручы пад увагу слабую вывучанасць рэспублікі і абмежаваныя навуковыя сілы, збіранне сябрамі раённых краязнаучых арганізацый матэрыялау па гісторыі, прыродзе і эканоміцы Беларусі было найважнейшай умовай стварэння паунавартаснай крыніцазнаучай навуковай базы.

Аналіз краязнаучай перыёдыкі тых гадоу дазваляе нам сцвярджаць, што у БССР напрыканцы 20-х гг. існавала прынамсі 23 раённыя краязнаучыя музеі. Музеі існавалі у Азарычах, Асіпавічах, Бешанковічах, Быхаве, Бярэзіне, Вушачах, Гарадку, Дрысе, Камарыне, Капаткевічах, Капылі, Лагойску, Лепелі, Мсціслаулі, Нароулі, Смалявічах, Смілавічах, Суражы, Сянне, Тураве, Хоцімску, Чырыкаве, Чэрвені.

У той жа час на стадыі фарміравання знаходзіліся музеі краязнаучых таварыствау у Асвеі, Бялынічах, Грэску, Горках, Жлобіне, Клічаве, Лельчыцах, Лёзне, Міласлаулі, Рагачове, Самахвалавічах, Старых Дарогах, Уваравічах, Чашніках, Чырвонай Слабадзе, Шклове. Лепшы раённы краязнаучы музей знаходзіуся у Асіпавіцкім раёне, які ЦБК у 1927 г. вызначыла як узорны. Музей быу адкрыты для усеагульнага агляду у сакавіку 1928 г. у будынку Асіпавіцкай чыгуначнай школы. Зборам экспанатау, афармленнем экспазіцыі і правядзеннем экскурсій займалася музейная камісія з чатырох чалавек пад кірауніцтвам настауніка А. Немцава[18].

З 1927 г. прыцягвалі увагу навукоуцау і шырокіх колау грамадскасці прыродазнаучыя, этнаграфічныя і нумізматычныя калекцыі раённых края-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

знаучых музеяу у Чэрвені (загадчык У. Дземяшкевіч), Чырыкаве (загадчык Зыкау), Смілавічах (загадчык А. Шыдлоускі).

1928–1929 гг. былі часам найвышэйшага узлёту музейна-краязнаучага руху у БССР, да якога далучаюцца асобы рознага грамадскага становішча і рознай ступені падрыхтоукі, але у асноуным інтэлігентных прафесій і навучэнцы. Выяуленне, улік, ахова і выкарыстанне культурных каштоунасцей робіцца асноуным напрамкам дзейнасці большасці краязнаучых арганізацый, што спрыяе узнікненню новых музеяу. У БССР на 1.01.1928 г., па нашых падліках, існавала 7 акруговых і 23 раённыя грамадскія краязнаучыя музеі.

імкненне накіраваць краязнаучы рух у рэчышча бягучых гаспадарчых патрэб ужо у сярэдзіне 30-х гг. прывяло да катастрафічных вынікау – была ліквідавана большасць краязнаучых арганізацый разам з іх музеямі. Большасць каштоуных калекцый загінула. У выніку цяжкі удар атрымала не толькі навука, страціушая сваю крыніцазнаучую базу, але і маральны стан грамадства. Краязнауства на дзесяцігоддзі апынулася убаку ад асноунага напрамку навуковых даследаванняу і актыунага грамадскага жыцця. Пачаліся рэпрэсіі краязнауцау, нават тых, хто займауся вывучэннем гісторыі рэвалюцыйнага руху.

Дзейнасць краязнауцау 20-х гг. мела вялікае значэнне для развіцця навукі, уздымала інтэлектуальны узровень правінцыяльных гарадоу і вёсак, спрыяла адукацыі шырокіх колау насельніцтва, прыцягвала да актыунага жыцця старую інтэлігенцыю. Значныя заслугі краязнауцау, асабліва тых, хто працавау у музеях і архівах, – у развіцці спецыяльных гістарычных і філалагічных дысцыплін, у распрацоуцы метадау атрыбуцыі і апісання музейных прадметау, рукапісау, выданняу. Менавіта вынікі дзейнасці краязнауцау, якія на базе сабраных матэрыялау праводзілі канкрэтныя даследаванні, дазволілі савецкай гістарычнай навуцы захавацца у гады панавання сацыялагічнай вульгарызацыі. Такім чынам, краязнаучая дзейнасць мела выключнае значэнне для вывучэння мінулага і развіцця нацыянальнай культуры Беларусі.

[1] Гл.: Шмидт С. «Золотое десятилетие» советского краеведения // Отечество. Краеведческий альманах. М., 1990. С. 11.
[2] Гл.: Наш край. 1925. № 1. С. 38.
[3] Гл.: Ліпкін Б. Паказ у музэях лясоу тутэйшага краю // Наш край. 1927. № 4. С. 30–31; Зьбіткоускі М. Настауленне да зьбіраньня расьлін і назіраньняу над імі // Наш край. 1927. № 5. С. 35–36; Сташэускі. Органіаваньне раённага музэю // Наш край. 1929. № 1. С. 54.
[4] Гл.: Наш край. 1927. № 8–9. С. 83.
[5] Гл.: Там жа. 1928. № 6–7. С. 85.
[6] Гл.: Там жа. 1926. № 8–9. С. 66.
[7] Гл.: Там жа. 1926. № 2–3. С. 80.
[8] Гл.: Полымя. 1923. № 5–6. С. 164.
[9] Гл.: Савецкая Беларусь. 1923. № 115.
[10] Гл.: Мікіцінскі У. Слуцкі раённы краязнаучы музэй // Наш край. 1928. № 1. С. 29.
[11] Гл.: Наш край. 1927. № 3. С. 63.
[12] Гл.: Там жа. 1926. № 2–3. С. 87.
[13] Гл.: Там жа. 1930. № 5–6. С. 79.
[14] Гл.: Там жа. 1926. № 6–7. С. 75.
[15] Гл.: Там жа. 1926. № 10–11. С. 71.
[16] Гл.: Там жа. 1927. № 5. С. 67.
[17] Гл.: Там жа. 1929. № 3. С. 62.
[18] Гл.: Там жа. 1928. № 5. С. 60.
[19] Гл.: Аканові Г. і інш. Музэй Асіпавіцкай чыгуначнай школы // Наш край. 1928. № 4. С. 64.

***Гужалоускі Аляксандр Аляксандравіч*** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтвау БДУ.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm